# Скарбы маёй краіны

## Класная гадзіна для вучняў сярэдняга звяна

**В. Я. Рабчук,**
настаўнік матэматыкі Белалясоцкага ВПК дзіцячы сад – базавая школа

**Мэты:**

**Адукацыйныя:** садзейнічаць прывіццю падрастаючаму пакаленню павагі да дзяржаўных каштоўнасцей.

**Развіваючыя:** стварыць умовы для развіцця нацыянальнага самапазнання, вызначэння месца краіны ў свеце, увагі, самастойнасці дзеянняў.

**Выхаваўчыя:** імкнуцца выхоўваць любоў да Радзімы, добрасумленасць і дысцыплінаванасць.

**Абсталяванне**: геаграфічная карта РБ, скрыня, клейкая папера.

## Ход мерапрыемства

**Настаўнік**. Прывітанне, паважаныя настаўнікі, эрудыраваныя вучні.

Сення мы з вамі пагаворым пра нашу родную зямлю, пра нашую адзіную карміліцу. Давайце падумаем, якая наша Беларусь?

*Настаўнік бярэ загатоўку намаляванай скрыні, вешае яе на дошку.*

**Настаўнік**. Зараз я вам раздам карткі, а вы мне напішыце пра тое, якая наша Беларусь. Гэтыя карткі зложым у скрыню.

*Дзеці пішуць, наклейваюць на скрыню. Потым настаўнік каменціруе кожную картку.*

**Настаўнік**. А зараз я пакладу ў скрыню скарбы – тое, чым багата наша краіна (чыстае паветра,  бытавая тэхніка, шкло, тканіны, адзенне, абутак, фарфор, драўніна).

*Вучань падыходзіць да скрыні і бярэ першы “скарб”, каменціруе.*

1. **<u>Тканіны</u>**

**Вучань.** Як вядома, прадукцыяй прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці з'яўляюцца тканіны, швейныя, трыкатажныя, футравыя, галантарэйныя вырабы, абутак. У адпаведнасці з гэтым у складзе лёгкай прамысловасці

прынята вылучаць тэкстыльную, швейную, трыкатажную, футравую, галантарэйную, гарбарна-абутковую прамысловасць. Усе названыя галіны лёгкай прамысловасці атрымалі развіццё на Беларусі. Яны выкарыстоўваюць сельскагаспадарчую сыравіну (лён, воўну, скуры) і сыравіну хімічнага паходжання (хімічныя валокны, штучныя скуры, штучнае футра). Частка сыравіны завозіцца з-за межаў Беларусі.

На Беларусі выпускаюцца ўсе галоўныя віды тканін: ільняныя, шарсцяныя, шаўковыя і баваўняныя. Беларусь — адзін з галоўных вытворцаў **ільняных тканін** сярод краін свету. Выпуск ільняных тканін сканцэнтраваны на Аршанскім ільнокамбінаце. Ен атрымоўвае льновалакно ад шматлікіх ільнозаводаў, што размешчаны ва ўсіх абласцях.

*Адзін з вучняў ідзе да карты, шукае горад Оршу і адзначае гэта месца знакам (напрыклад, зялены трохвугольнік).*

Галоўны вытворца шарсцяных тканін — Мінскі камвольны камбінат. **Шарсцяныя тканіны** вырабляюцца таксама на Мінскім і Гродзенскім тонкасуконных камбінатах; шарсцяная і паўшарсцяная пража — у Слоніме. У Брэсце і Віцебску працуюць буйныя дывановыя камбінаты.

*Адзін з вучняў ідзе да карты і шукае гарады Мінск, Гродна, Брэст, Слонім і адзначае іх знакам.*

Больш за ўсе выпускаецца **шаўковых тканін,** сыравінай для якіх служаць хімічныя валокны. Вытворчасць шаўковых тканін сканцэнтравана ў Магілёве, Віцебску і Кобрыне.

Поўнасцю на прывазной сыравіне працуе Баранавіцкі баваўняны камбінат — адзіны буйны вытворца **баваўняных тканін** на Беларусі.

*Адзін з вучняў ідзе да карты і шукае гарады Магілёў, Віцебск, Кобрын, Баранавічы і адзначае іх знакам.*

*Другі вучань падходзіць да скрыні і бярэ “скарб”, каменціруе.*

**2. <u>Адзенне</u>**

**Вучань.** Швейныя і трыкатажныя вырабы выпускаюцца не толькі буйнымі дзяржаўнымі прадпрыемствамі, але і невялікімі атэлье, кааператывамі, асобамі, што займаюцца індывідуальнай працоўнай

дзейнасцю. Швейныя або трыкатажныя атэлье, напрыклад, ёсць практычна ва ўсіх гарадах і пасёлках гарадскога тыпу.

Пераважная большасць вырабаў прыпадае на буйныя вытворчыя аб'яднанні і прадпрыемствы швейнай і трыкатажнай прамысловасці. Сярод іх швейныя фабрыкі «Мілавіца», «Элема», «Прагрэс» у **Мінску**, фабрыкі "Лакрэс", "Гомельчанка", "Камінтэрн" у **Гомелі**, "Бабруйсктрыкатаж", "Вяснянка" ў **Магілёве**, "Баранавіцкая трыкатажная фабрыка" , «Світанак» у **Жодзіна**, "Нартэкс", "Чараўніца" ў **Віцебску** і інш.

Карыстаецца попытам прадукцыя Салігорскага народнага прадпрыемства «Купалінка» — дзіцячая, жаночая і мужчынская вопратка.

Да ліку найбольш вядомых прадпрыемстваў трыкатажнай прамысловасці адносяцца камбінаты і фабрыкі ў **Пінску**, **Салігорску**, **Віцебску**, **Гомелі**, **Мінску**, **Жодзіне**.

*Адзін з вучняў ідзе да карты і шукае гарады Пінск, Салігорск, Гомель, Жодзіна, Баранавічы, Дзяржынск, Бабруйск і адзначае іх знакам.*

*Трэці вучань падходзіць да скрыні і бярэ "скарб", каменціруе.*

3. **Абутак**

**Вучань.** Цэнтрамі гарбарнай прамысловасці з'яўляюцца таксама **Гродна**, **Бабруйск**, **Магілёў**. Найбольш вядомыя абутковыя прадпрыемствы – «Прамень» у **Мінску**, «Неман» у **Гродне**, сумеснае беларуска-германскае «Белвест», «Марка» ў **Віцебску**, **Лідская** і **Бабруйская** абутковыя фабрыкі.

Емістасць беларускага рынку абутку складае 9 млн. пар у год – і гэтая колькасць сапраўды прадаецца.

*Адзін з вучняў ідзе да карты і шукае гарады Гродна, Бабруйск, Магілёў, Мінск, Ліда, Віцебск і адзначае іх знакам.*

*Чацвёрты вучань падходзіць да скрыні і бярэ "скарб", каменціруе.*

4. **Шкло**

**Вучань.** Археалагічныя раскопкі сведчаць, што вытворчасць шкла існавала ўжо ў II-IV стст. З XVI ст. на Беларусі вядомы **гуты** — невялікія прадпрыемствы па вырабе шкла. Гуты ўзнікалі там, дзе меліся кварцавыя

пяскі, прыдатныя для вырабу шкла. Бярозавыя дровы, бярозавыя і хваёвыя карчы выкарыстоўваліся ў якасці паліва.

У пачатку XVIII ст. прадстаўнікамі знакамітага роду беларускіх князёў Радзівілаў былі заснаваны першыя на Беларусі **шкляныя мануфактуры.** Налібоцкая мануфактура была вядомым для свайго часу прадпрыемствам. Тут варылі не толькі бясколернае, але каляровае шкло: рубінавае, зялёнае і сіняе з ізумрудным адценнем, выпускалі вырабы з крышталю. Вырабы Налібоцкай шкляной мануфактуры паступалі на продаж на працягу 150 гадоў. Шырока былі вядомы таксама вырабы Урэцкай мануфактуры (цяпер гарадскі пасёлак Урэчча ў Любанскім раёне Мінскай вобласці). Гэта была першая люстэркавая мануфактура. Вялізныя люстэркі і крышталёвыя люстры ўрэцкіх майстроў аздаблялі пакоі замкаў. Выраблялі тут шкляны посуд, аконнае і аптэчнае шкло. Урэцкая мануфактура існавала звыш 100 гадоў. У цяперашні час налічваецца каля 25 прадпрыемстваў гэтай галіны. Найбольш буйнымі па колькасці працуючых і кошту выпускаемай прадукцыі з'яўляюцца шклозавод «Неман» у маладым горадзе **Бярозаўка** на Гродзеншчыне, **Барысаўскі** крышталёвы і **Гомельскі** шклозавод.

*Дзеці выходзяць да дошкі, шукаюць на карце горад і наклейваюць знак.*

Шкляны посуд, вырабы *з* крышталю майстроў завода **«Неман»** і **Барысаўскага** крышталёвага завода карыстаюцца шырокім попытам на Беларусі і за яе межамі. **Гомельскі** шклозавод выпускае аконнае і вітрыннае шкло. Ліставое і ўзорыстае шкло вырабляецца на **Гродзенскім** шклозаводзе. Астатнія шклозаводы (пасёлак Глуша, Ялізава ў Магілёускай вобл. і інш.) выпускаюць пераважна бутэлькі, слоікі для розных галін харчовай прамысловасці. Працуюць 4 люстраныя фабрыкі ў **Мінску**, **Бабруйску**, **Гомелі** і **Целяханах**.

*Адзін з вучняў ідзе да карты і шукае гарады Бярозаўка, Барысаў, Гомель, Мінск, Бабруйск, Целяханы і адзначае іх знакам.*

*Пяты вучань падходзіць да скрыні і бярэ наступны "скарб", каменціруе.*

**5. Фарфор**

**Вучань.** Папярэднікамі сучаснай фарфоравай вытворчасці з'яўляюцца ганчарныя рамёствы, якія ўзніклі ў глыбокай старажытнасці. Да самых старажытных ганчарных вырабаў адносіцца гліняны посуд: гаршкі, кубкі, міскі, збаны, глякі і інш. Ганчарства развівалася на працягу стагоддзяў, больш разнастайнымі і дасканалымі станавіліся вырабы. 3 цягам часу з'явіліся вырабы дэкаратыўнай і мастацкай керамікі: розныя скульптуры, фігурны посуд, вазоны, букетнікі, дзіцячыя цацкі. Атрымала развіццё вытворчасць кафлі — керамічнай пліткі для аздаблення печаў, дахоўкі, ці чарапіцы,— пліткі для пакрыцця дахаў.

У цяперашні час на Беларусі дзейнічаюць на мясцовай і прывазной сыравіне буйныя прадпрыемствы фарфоравай прамысловасці — **Мінскі фарфоравы завод і Добрушскі завод фарфоравага посуду.** Яны выпускаюць разнастайны фарфоравы посуд: талеркі, сподачкі, кубкі, чайнікі, салатніцы, сервізы. Прадпрыемствы вытворчага аб'яднання «Беларуская мастацкая кераміка» ў **Радашковічах і Івянцы** выпускаюць посуд і дэкаратыўныя керамічныя вырабы.

*Адзін з вучняў ідзе да карты і шукае гарады Мінск, Добруш, Радашковічы, Івянец і адзначае іх знакам.*

*Шосты вучань падходзіць да скрыні і бярэ "скарб", каменціруе.*

### 6. <u>Бытавая тэхніка</u>

**Вучань.** У нашай краіне выпускаюцца вырабы, разлічаныя на доўгатэрміновае карыстанне: халадзільнікі, тэлевізары, радыёпрыёмнікі, магнітафоны, гадзіннікі, фотаапараты, матацыклы, веласіпеды. (*Пытанні для вучняў: хто любіць глядзець тэлевізар? Хто любіць катацца на веласіпедзе?*) Для некаторых заводаў тавары спажывання з'яўляюцца асноўнай прадукцыяй. Да іх ліку адносяцца, напрыклад, мінскія заводы: гадзіннікавы, мотавелазавод, халадзільнікаў. Тэлевізары выпускаюцца вытворчымі аб'яднаннямі «Гарызонт» у **Мінску** і «Віцязь» у **Віцебску**, магнітафоны — у **Магілёве і Брэсце,** радыёпрыёмнікі, аўтамагнітолы — у **Гродне, Маладзечна і Мінску**, халадзільнікі вядомай маркі "Атлант" у Мінску, фотаапараты – заводамі «Зеніт» у **Магілеве і Вілейцы**.

*Вучні адзначаюць гарады Мінск, Віцебск, Магілёў, Брэст, Гродна, Маладзечна, Вілейка на карце.*

*Наступны вучань падыходзіць за "скарбам", каменціруе.*

**7. Драўніна**

**Вучань.** Буйныя цэнтры лесапілення і дрэвапрацоўкі будаваліся перш за ўсе ў гарадах, размешчаных на рэках (рэкі выкарыстоўваліся для сплаву лесу): Барысаў і Бабруйск на Бярэзіне, Гомель на Сожы, Пінск і Мозыр на Прыпяці. Тут выпускаюцца піламатэрыялы, фанера, мэбля, драўнянастружкавыя і драўнянавалакністыя пліты, у **Пінску і Барысаве** — запалкі. **Рэчыца** на Дняпры, **Масты** на Немане – перш за ўсе буйныя цэнтры вытворчасці фанеры. Налічваецца звыш 30 прадпрыемстваў па вытворчасці розных відаў мэблі. На прадпрыемствах **дрэваапрацоўчай прамысловасці** выпускаецца мэбля. Агульная колькасць на Беларусі дрэваапрацоўчых вытворчых аб'яднанняў, у складзе якіх маецца вытворчасць мэблі, і самастойных мэблевых фабрык складае больш за 30. Яны працуюць ва ўсіх абласцях. Да ліку самых буйных адносяцца прадпрыемствы ў **Мінску, Гомелі, Бабруйску, Пінску, Віцебску, Мастах**. Да дрэваапрацоучай прамысловасці адносіцца адзіная на Беларусі лыжная фабрыка, што знаходзіцца ў гарадскім пасёлку Целяханы Івацэвіцкага раёна. У якасці тавараў спажывання ў значнай ступені выкарыстоўваецца прадукцыя **цэлюлозна-папяровай прамысловасці:** сшыткі, блакноты, альбомы. Сярод 13 прадпрыемстваў гэтай галіны самым буйным з'яўляецца **Светлагорскі** цэлюлозна-папяровы камбінат. **Слонімскі** кардонна-папяровы завод выпускае розныя віды паперы і кардону, фоташпалеры. **Добрушская** папяровая фабрыка — сшыткі, альбомы. Вытворчасць газетнай паперы асвойваецца на **Чашніцкай і Шклоўскай** папяровых фабрыках. Да гэтага часу газетная папера на Беларусі не выпускалася. Да ліку старэйшых прадпрыемстваў адносяцца папяровая фабрыка ў Шклове, кардонная фабрыка ў пасёлку Светлы Бор Пухавіцкага раёна.

На вытворчасці шпалер спецыялізуецца **Гомельская** шпалерная фабрыка, у **Барысаве** выпускаецца папера для джяржзнакаў.

Папяровыя і кардонныя фабрыкі Беларусі выкарыстоўваюць пераважна прывазную цэлюлозу. Наша краіна завозіць таксама тыя віды паперы і кардону, якія не выпускаюцца на ўласных прадпрыемствах. У той жа час частка прадукцыі цэлюлозна-папяровай прамысловасці вывозіцца за межы Беларусі.

*Вучні шукаюць гарады Мінск, Гомель, Барысаў, Добруш, Шклоў, Слонім, Светлагорск.*

**Настаўнік.** Калі паглядзець на карту нашай краіны, то мы бачым, што наша Беларусь развіваецца, бачым, што адзначыўшы на карце тыя прадпрыемствы, пра якія мы гаварылі, можна ўпэўніцца ў тым, што наша краіна багатая "скарбамі". І сення мы назвалі толькі частку прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, не назвалі ўсе вытворчасці, з якіх складаецца гаспадарка Беларусі. Мяркую, што мы далей будзем з імі знаеміцца, таму што калі паглядзець у скрыню, то там знаходзіцца яшчэ шмат "скарбаў" (*пакладзены ў скрыню збожжа, бульба, гародніна, лендаўгунец, цукар, лакі, фарбы, хімічныя валокны і ніткі, аўтамабілі, матацыклы, веласіпеды, камбайны трактары і інш.)*

А зараз праверым, што вы засвоілі.

*Дзецям прапануецца выканаць тэст.*

**Праверачны тэст**

*У розных месцах класа развешаны літары* ***а, б, в.***

*Вучні чытаюць пытанне на дошцы і, у залежнасці ад таго, які варыянт яны лічаць правільным, становяцца каля гэтай літары (правільны адказ падкрэслены).*

1) У якім горадзе знаходзіцца абутковае прадпрыемства "Неман"?

а) <u>Гродна;</u>

б) Мінск;

в) Пружаны.

2) У якім горадзе есць люстраная фабрыка?

а) <u>Гомель;</u>

б) Салігорск;

в) Брэст.

3) Дзе не размешчаны заводы фарфоравага посуду?

а) Мінск;

б) Добруш;

в) Целяханы.

4) Што выпускае вытворчае аб’яднанне «Гарызонт»?

а) халадзільнікі;

б) тэлевізары;

в) газавыя пліты.

5) Дзе знаходзіцца лыжная фабрыка?

а) Целяханы;

б) Мінск;

в) Бабруйск.

6) Выпуск ільняных тканін сканцэнтраваны на:

а) Шклоўскім ільнозаводзе;

б) Пружанскім ільнозаводзе;

в) Аршанскім ільнокамбінаце.

7) Прадпрыества “Світанак” займаецца выпускам:

а) дываноў;

б) трыкатажнага адзення;

в) сумак.

**Падводзяцца вынікі мерапрыемства.**

**Літаратура**

1. Брылеўскі М. М. Геаграфія Беларусі 10 клас / М. М. Брылеўскі, Г. С. Смалякоў, М. Ц. Яльчык. – Мінск, “Народная асвета”, 2007.

Выкарыстаны матэрыялы сайтаў http://www.spr.by/all/shveynie-fabriki/, http://zavody.minsk.mnogonado.by/, http://govorim.by/minskaya-oblast/vileyka/info-o-vileyke/36645-predpriyatiya-vileyki.html